навіны MASTY.BY

№ 1 сакавік 2004 г.

*Маладзёвы бюлетэнь Мастоўшчыны*

Мы распачынаем выданьне маладзёвага бюлетэню, які будзе інфармаваць мастоўскую моладзь аб падзеях рознага кірунку - культурнага, музычнага, грамадзкага жыцьця Мастоўшчыны, Гарадзеншчыны ды й увогуле ўсяго нашага краю - усё, што мае дачыненьне да Беларушчыны. Спадзяёмся, што вам спадабаецца нашая праца і мы зможам выходзіць штомесячна

***рэдакцыйная калегія***

# 25 САКАВІКА - ВЯСНА БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЬЦІ



Уладзімер Каўшовік

Мастоўскі Малады Фронт сьвяткуе 85 угодкі абвяшчэньня БНР

*86 раз мы адзначаем сьвята, што сталася родным кожнаму сьвядомаму беларусу. Сьвята, якое сонечным праменьчыкам веснавога дня саграваламі дагэтуль саграе сэрца Беларусу, які менавіта ў гэты Дзень у 1918 годзе вырашыў, што ня хоча ніякай іншай, ані маскоўскай, ані польскай улады над сабою, акрамя сваёй роднай беларускай, і абвесьціў*

**НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ КРАЮ.**

***Са сьвятам, спадарове, з Днём Волі!***

# Фронт Маладых

**7 лютага ў Горадні, створана Гарадзенская абласная арганізацыя “Малады Фронт”. На ёй былі прадстаўлены дэлегаты 9 раёнаў Гарадзеншчыны. Моладзь вылучыла ад Гарадзеншчыны свайго кандыдата на пасаду старшыні “Маладога Фронту” Беларусі, ім стаў 22 гадовы старшыня Менскай гарадской арганізацыі “Малады Фронт” Зьміцер Дашкевіч. Прадстаўнікі мастоўскай арганізацыі “Маладога Фронту” таксама , прысутнічалі на важкім сходзе абласной арганізацыі.**

Сваім галоўным прыярытэтам на бліжэйшы 2004год моладзь вызначыла ўдзел у выбарах у парлямэнт Беларусі. Маладзёны вырашылі паспрабаваць свае сілы як у якасьці кандыдатаў ад блёку “Маладая Беларусь”, так і ў ролі мэнэджэраў, валянтэраў і назіральнікаў.

Намесьнікамі старшыні арганізацыі абраныя Яўген Лабко зь Ліды, ды Сяргей Ляшкевіч з Шчучына. Удзел у працы канфэрэнцыі ўзялі 16 дэлегатаў-прадстаўнікоў мясцовых філій МФ з Горадні, Мастоў, Ліды, Шчучына, Карэліч, Ваўкавыска, Гарадзенскага раёна, Зэльвы ды Сьвіслачы. На ўстаноўчым сходзе абласнога МФ прысутнічалі намесьнікі старшыні Маладога Фронта Беларусі - Сяржук Бахун і Аляксей Шэйн.

***З.К.***

## Абвестка

Хочаш адзначыць Дзень Волі ў лепшых традыцыях 1918 г.?

Тэлефануй на нумар 3-11-95 (Сяржук).

Канспэратыўнасьць, рэвалюцыйнасьць, кола аднадумцаў, сяброўская атмасфэра бээнэраўскіх часоў гарантуецца.

***Сьвяткуйма разам!***

# Малады Фронт - зьмена пакаленьняў



***Чарговы пяты Сойм Маладога Фронту прызначаны на 30 траўня 2004 г. Але дата правядзеньня можа быць перанесена на 23 траўня альбо 6 чэрвеня, таму што менавіта ў гэты дзень праводзіцца ўсебеларускі тэст па беларускай мове, і вялікая колькасьць сябраў МФ будзе прымаць у ім удзел.***

Ужо зараз вядома, што **Павал Севярынец** (на здымку справа), які з сваіх 27 гадоў ужо 7 зьяўляецца старшынём МФ, балятавацца на гэту пасаду ня будзе. На сёньняшні час вылучана 2 прэтэндэнта на пасаду старшыні МФ: **Зьміцер Дашкевіч і Сяржук Лісічонак**.

## Зьміцер Дашкевіч



Зьм. Дашкевіч падпальвае расейскія грошы у час акцыі супраць увядзеньня расейскага рубля

нарадзіўся ў 1981 г. у в. Кушняры, Івацэвіцкага раёну. Сканчаў школу ў Старых Дарогах. Вучыўся ў Гарадзенскім агратэхнічным універсытэце, але той яму не ўпадабаў і Зьміцер працягнуў вучобу ў Віленскім пэдунівэрсытэце на факультэце славістыкі, дзе вывучае зараз беларускую філялёгію і журналістыку на 2-м курсе. У МФ прыйшоў у 2001 г., быў адказны за вулічныя масавыя акцыі. Зьяўляецца старшынём Менскай гарадзкой Рады МФ. Зьбіраецца ўдзельнічаць у выбарах у палату прадстаўнікоў у Старых Дарогах. Ідэал беларускага дзеяча - Янка Купала.

Паводле Зьмітра асноўным прыярытэтам МФ і надалей застануцца вулічныя акцыі. Тут ён паслядоўна працягвае традыцыі Паўла Севярынца, які таксама лічыць гэтую дзейнасьць прыярытэтнай. Гарадзенская, Гомельская абласныя, а таксама Менская гарадзкая арганізацыі МФ вылучылі Зьм. Дашкевіча на пасаду старшыні МФ. Сп. Дашкевіч плянуе наведаць г. Масты ў траўні месяцы, каб асабіста пазнаёміцца з мастоўскімі маладафронтаўцамі.

## Сяржук Лісічонак

нарадзіўся ў Менску ў 1980 г., скончыў юрфак БДУ у 2003 г., цяпер вучыцца ў БДЭУ па спэцыяльнасьці “Эканоміка і кіраваньне прадпрыемствам”. З 1999 г. у МФ, быў сакратаром міжнароднай камісіі. Узначальвае міжнародны аддзел МФ, быў каардынатарам выбарчага блёку “Маладая Беларусь”. У 2003 балятаваўся кандыдатам у дэпутаты Менгарсавета, але ж па просьбе адміністрацыі БДУ зьняў сваю кандыдатуру. Ідэал грамадзкага дзеяча Леў Сапега.

Сяржук бачыць МФ элітарнай арганізацыяй, што прапагандуе ідэі, заснаваныя на маральнай чысьціні, адкрытасьці, праўдзе, якая складзе альтэрнатыву БРСМу. Магілеўская абласная арганізацыя вылучыла Сяржука Лісічонка на пасаду старшыні Працэдура вылучэньня прайшла з парушэньнямі (на раду былі запрошаны прадстаўнікі Воршы Віцебскай вобл. і не было прадстаўнікоў з Бабруйска і Асіповіч)



*Пакуль вярсталася газэта, нам стала вядома, што Берасьцейская абласная арганізацыя МФ вылучыла на пасаду старшыні МФ свайго лідэра - Сержука Бахуна. Але ж у кулюарах МФ ходзяць чуткі, што сп. Бахун зьбіраецца зьняць сваю кандыдатуру на карысьць сп. Лісічонка.*

***Падрыхтаваў ZK***

Цэнтральная Рада Маладога Фронту 4 - га скліканьня адбудзецца 16 красавіка на штаб-кватэры МФ у Менску. У Цэнтральную Раду ўключана 3 чалавекі з Мастоў.

# Music news ад www.music.fromby.net

www.music.fromby.net адзін з найбольш папулярных вузлоў, прысьвечаных беларускай музыцы, быў адчынены ў кастрычніку 2003 г. Галоўнае, што тут зьмяшчаецца, гэты гід-парад, які складаецца з 12 беларускамоўных песень розных гуртоў. За найбольш упадабаную песьню можна прагаласаваць на працягу двух тыдняў. На вузельчыку можна знайсьці навіны беларускай музычнай прасторы, рэцэнзіі, cd-краму, а таксама скачаць песьні розных гуртоў у фармаце mp3.




## Цікавосьці

*Навучэнцы зачыненага беларускімі ўладамі ліцэю падрыхтавалі да выданьня другую плытку "ліцэйскага панку, рок-н-ролу, блюзу ды джазу" пад назовам "Я люблю ліцэй: Веру ў Цябе".*

У красавіку адбудзецца фэст "Рок-каранацыя". Можна будзе паўдзельнічаць у вызначэньні лепшых гуртоў не адыходзячы ад кампутара - праз сеціва. Асаблівасьці галасаваньня паведамім пазьней.

## 9-ы тур галасаваньня. 24.02-09.03.2004

**1 Апотом. Песьня сапраўднага каўбоя**
**2 WZ-Orkiestra. Я ішоў да цябе**
**3 N.R.M.. Рок-н-рол не ўратуе**
**4 Garadzkija. Сам на сам**
**5 B:N:. Толькі я**
**6 Памідораў. Дзень без гарэлкі**
**7 Стары Ольса. У Карчме**
**8 Аляксандра і Канстанцін. My Galileo**
**9 Юр`я. А ў лузі**
**10 Цмок і малыш. Баба Лена**
**11 J-Морс. Глядзі**
**12 Харлі. Купаліначка**

## Вялікі тур NRM

***NRM не забываюцца на сваіх прыхільнікаў ня толькі ў Менску, а і ў іншых гарадох.***
20.03 - яны будуць у Беластоку (клюб "Fabryka"), каб пацешыць тамтэйшых фэнаў , 22.03 - візыт у Варшаву (клюб "Proxima"), а ***праз два дні яны ўжо будуць у Горадні у Гарнізонным доме афіцэраў***, і далей - без адпачынку: 25.03 - Берасьце (Абласны ДК Прафсаюзаў), 26.03 - Мазыр (клюб "55"), 28.03 - Гомель (клюб "Адрэналін"), 29.03 - Магілеў (заля Абласной Філярмоніі).

паводле **www.music.fromby.net**

# Who is who?

Здагадайся, што за музыкі зьмешчаны на фотаздымках





**Выражы фотаздымкі, падпішы імёны і прозвішчы музыкаў ды дашлі на адрэсу: Зьмітру, *вул. Цэткін д.9, кв.20, г. Масты, 231600***

**Тыя, хто першымі дашле правільныя адказы,атрымае прэзэнты. Якія? Убачыце самыя!**

***Чакаем адказаў!***





**www.mfront.org**






**Ты ні знаіш, дарагая, пачэму наш сын на нас такой ні пахожый?**

# 45 - выдатны ўзрост, асаблiва для школы


Уладзімер Каўшовік

## Школьныя жарты

Настаўніца пасьля прагляду сшытка з хатнім заданьнем маленькага Яські кажа:
-Здаецца, што гэта почырк Марылькі, тваёй суседкі па парце?
-Так, я вымушаны быў выканаць хатняе заданьне з дапамогай марыськінай асадкі.

Мова выданьня беларуская, рэдакцыйны правапіс клясычны (паводле граматыкі Бранiслава Тарашкевіча), матэрыялы таксама могуць друкавацца з выкарыстаньнем іншых граматык беларускай мовы, па жаданьню аўтараў, але пры строгай рэглямэнтацыі рэдакцыйнай калегіі.
Усе матэрыялы праходзяць жорсткую рэдакцыйную цэнзуру на адпаведнасьць ідэялягічнай сістэме беларускай дзяржавы. Аўтары матэрыялаў ня могуць ня несьці адказнасьць за сваe матэрыялы.
Кошт аднаго асобніка 1 талер (грошы просім пералічваць адразу пасьля увядзеньня дадзенай грашовай сыстэмы ў Рэспубліцы Беларусь).

Рэдактар:
Зьміцер Кухлей

**Наклад:**
***299 ас.***

## ГІСТОРЫЯ ШКОЛЫ

Школа адкрыта ў 1959 годзе як сямігадовая. З 1961 года стала васьмігадовай. З 1 верасня 1970 года стала сярэдняй. З 1959 г. па 1970 г. васьмігадовую школу скончыў 381 вучань. У сярэдняй школе адбылося 32 выпускі. Са сцен школы выйшла 1612 выпускнікоў. З іх узнагароджана сярэбранымі і залатымі медалямі 285 выпускнікоў.

Самымі ўраджайнымі на медалі з'яўляюцца: 1981 г.- 14 выпускнікоў з 47 атрымалі медалі: 1992 г.- 12 з 36; 1993г.- 16 з 31; 1997г.- 15 з 34; 1998г.- 20 з 55; 1999г.- 17 з 47; 2001г.- 13 з 39; 2002г.- 9 з 71. Кожны год амаль палова, а ў асобныя гады і больш выпускнікоў, паступае ў ВНУ. У 2002г. З 71 выпускнікоў 38 паступіла ў ВНУ-54%, з іх у педагагічныя 14 (36,8%), у ССНУ- 18(25%), у ПТВ-6(8,6%) выпускнікоў.

## КАДРЫ(у гэтым выпадку тэрмін скарыстоўваецца не ў зьвязку з кінаіндустрыяй, а для азначэньня настаўнікаў)

У школе працуе 67 педагогаў. З іх вышэйшую катэгорыю маюць 24, першую 22, другую 15 і 6 настаўнікаў (маладыя спецыялісты) без катэгорыі. За 2001-2002 навучальны год павысіла прафесійную катэгорыю 10 настаўнікаў.
. Кіраўнікамі раённых МА настаўнікаў геаграфіі, матэматыкі, фізікі, пачатковых классаў, маладых настаўнікаў, маладых намеснікаў дырэктараў па выхаваўчай працы і настаўнікаў спецпадрыхтоўкі з'яўляюцца настаўнікі нашай школы. У школе працуе МА класных кіраўнікоў, клуб настаўнікаў беларускай і расейскай мовы і літаратуры, праблемная лабараторыя настаўнікаў матэматыкі, фізікі і інфарматыкі, школа станаўлення маладога настаўніка. Творчыя группы па вывучэнню Дальтан-тэхналогіі, тэхналогіі “Крок за крокам”, КСН і КТД, групы станаўлення педмастэрства і ўдасканалення педмайстэрства, метадычны савет.

## МАТЭРЫЯЛЬНАЕ ЗАБЯСПЯЧЭННЕ

У школе маецца 18 класных памяшканнеў, 6 з іх адведзена пад пачатковую школу. Для 4-11 класаў застаецца 12 памяшканняў. Усе падрыхтоўчыя класы займаюцца на базе д/с №1.
Школа працуе ў дзве змены:
1-я змена з 8.00
2-я змена-з 13.30
Паміж першай і другой зменай 20-ці хвілінны перапынак.
Наведванне сталовай па раскладу.
Усе заняткі ў школе заканчваюцца ў 18.40.
У школе маецца кампутарны клас.
Выкладанне АІ і ВТ вядзецца з 8-га класа.

## ФІНАНСАВАННЕ

Школа знаходзіцца на дзяржаўным бюджэце.
Базавыя прадпрыемствы школы:
Агрампрамтэхніка- Булак Павел Іванавіч
ПМС- Якубік Яўгеній Міхайлавіч
Спонсары:
СП ”Самана-Плюс”- Шумік Аляксандр Канстанцінавіч.

## АДМІНІСТРАЦЫЯ

Дырэктар школы- Яблонскі Анатолій Пятровіч
Наместнікі дырэктара:
Па вучэбнай рабоце- Жылінскі Генадзій Генрыхавіч
Шымановіч Вольга Мікалаеўна
Сытая Антаніна Сцяпанаўна
Па выхаваўчай рабоце- Бакланская Зоя Пятроўна.

*Падрыхтаваў*
***Алякс***